Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 50 (487) 20 СНЕЖНЯ 2000 г.

2000 ГОД АД НАРАДЖЭННЯ ІСУСА ХРЫСТА
2000 ГОД АД ПАЧАТКУ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ЭРЫ

МАЛІТВА

На гары сіянскай
На зямлі хрысьціянскай
Легла Божая Маці спачываці.
Прыйшоў Ісус Хрыстос пабуджаці.
Устань, Божая Маці, прабудзіся!
Свайму сыночку явіся!
Відзела сыночка бранага, рубанага,
На крыж крыжаванага.
Шыпшынай падперазаны,
Пярцом галоўка зьвязана,
Кап'ём рабро прабівана.
За ногці скабкі заганяны.
З-за ногцеў кроў капала
Друзою цела падала.
А ў нядзельку рана па нябесу
Божая Маці ходзіць,
Свайго Сыночка за ручку водзіць.
Пайяла сыночка на Ютрань
З Ютраньня на прыказаньня,
З прыказаньня на мора.
На моры камень,
На тым камені цэркаўка стаяла
А ў той цэркаўцы прыстолы стаяць,
Сьвечкі гараць,
сталы засьціланы,
кубкі наліваны.
За тым прыстолам Ісус Хрыстос
Сядзіць, рукі злажыўшы,
Галовачку схіліўшы,
Гарачую кроў праліўшы!
Госпадзі, госпадзі!
За каго я труджаўся, на муку падаўся?
За вас, грэшных!
За кроў хрысьціянску!
Не радуйцеся Пятро і Павел маёй мукі!
Вазьміце мой крыж у рукі!
Пахадзіце па ўсяму сьвету!
Закажыце старому і малому,
Беднаму і багатаму,
Сонейку праведнаму.
Хто маю малітву будзе,
рана, вечар маліць
Ад Бога ласку будзе мець!
У агні не пагарыць, у моры не патанець!
Ад зьвера бягучага!
Ад гада паўзучага!
Ад чалавека злога!
Аллілуе, Аллілуе! Слава табе, Госпадзі!

Гэтую малітву-замову запісала Мая Антонаўна Белая у жыхаркі вёскі Стракавічы Светлагорскага раёну Марыі Барсук. У тэксце захавана арфаграфія арыгіналу.

Адбылася абласная канферэнцыя ТБМ

9 снежня адбылася справаздачна-выбарчая Магілёўская абласная канферэнцыя.

На сённяшні дзень суполкі ТБМ дзейнічаюць у 12 раёнах Магілёшчыны. Таму на канферэнцыі былі дэлегаты ад Магілёўскай, Асіповіцкай, Шклоўскай, Бялыніцкай і іншых гарадскіх і раённых структур.

Зараз прайшлі перарэгістрацыю і стаяць на ўліку ў мясцовых органах улады Магілёўская абласная арганізацыя, Магілёўская гарадская, Асіповіцкая раённая, Бабруйская гарадская суполка, Горацкая раённая, Хоцімская і Шклоўская суполкі ТБМ. У бліжэйшы час плануецца рэгістрацыя Бялыніцкай раённай структуры ТБМ. Структыры і асобныя сябры ТБМ існуюць у Касцюковічах, Чэрыкаве, Слаўгарадзе, Мсціславе і Крычаве. Найбольш актыўна працуюць зараз сябры ТБМ у Магілёве, Бабруйску, Горках, Асіповічах і Шклове. Яны змагаюцца за беларускамоўную адукацыю, ладзяць вечарыны і сустрэчы з пісьменнікамі, збіраюць подпісы за адкрыццё БНУ, выпускаюць дзіцячыя і дарослыя газеты і бюлетэні, супрацоўнічаюць з афіцыйнымі беларускамоўнымі раённымі выданнямі.

На канферэнцыі прысутнічалі і мелі слова старшыня ТБМ Алег Трусаў і намеснік старшыні ТБМ Людміла Дзіцэвіч. У іх выступах ішла гаворка аб стварэнні рабочай групы па распрацоўцы Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі, аб удзеле структур ТБМ Магілёўшчыны ў Асамблеі неўрадавых арганізацый, аб актывізацыі збору подпісаў за адкрыццё БНУ і падпісцы на газету ТБМ "Наша слова", выдачы сябрам ТБМ новых пры-гожых пасведчанняў с сімволікай ТБМ, аб правядзенні на Магілёшчыне семінара "Я магу жыць лепей".

Удзельнікі канферэнцыі прынялі зварот да мясцовых уладаў г. Касцюковічы з патрабаваннем працаўладкаваць актывістку ТБМ, настаўніцу беларускай мовы і літаратуры Людмілу Леўчанку, якая была пазбаўлена працы за свае патрыятычныя патрабаванні.

На канферэнцыі быў заслуханы справаздачны даклад старшыні Магілёўскай абласной структуры ТБМ Міхася Булавіцкага і абрана новая рада ў складзе пяці чалавек. У яе ўвайшлі прадстаўнікі Магілёва, Асіповіч і Шклова. Старшынём арганізацыі прысутныя зноў абралі Міхвся Булавіцкага.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

Сямён Домаш – лідар беларускіх дэмакратычных сілаў

15 снежня Каардынацыйная рада Кангрэсу дэмакратычных сілаў разглядала пытанне вызначэння адзінага кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года.

Як вядома зацвярджаць прозвішча адзінага кандыдата будзе Кангрэс. Задача Каардынацыйнай рады выпрацаваць рэкамендацыі для Кангрэсу і мінімальна звузіць кола кандыдатур. Аптымальны варыянт, калі КРДС згодзіцца з адной кандыдатурай. Тады ёсць верагоднасць, што Кангрэс даволі лёгка вырашыць сваю задачу.

Пасля паседжання 15 снежня кола прэтэндэнтаў, якіх могуць падтрымаць дэмакратычныя сілы звузілася да трох чалавек: сп. Домаш, былы старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму і аблсавету, член Прэзідыюму Вярхоўнага Савету 13-га склікання, сп. Ганчарык – старшыня Федэрацыі прафсаюзаў беларускай (афіцыйныя прафсаюзы) і сп. Чыгір – былы прэм'ер-міністр. Разгляд кандыдатур паказаў, што рэйтынг Сямёна Домаша ў тры разы вышэйшы чым у Ганчарыка і яшчэ ў большай ступені перавышае рэйтынг М. Чыгіра.

Трэба адзначыць вырашальную ролю абласцей. Усе пяць абласцей (без Менскай, якая не аформлена арганізацыйна) выказаліся за Домаша.

Сямёна Домаша падтрымала і Асамблея няўрадавых арганізацый. Сваё рашэнне Рабочая група Асамблеі няўрадавых арганізацый прымала таксама 15 снежня. І тут вызначальная роля аказалася ў рэгіёнаў. Прадстаўнікі ўсіх шасці абласцей падтрымалі С. Домаша. Менск у значнай ступені таксама падтрымаў вобласці. Сямён Домаш атрымаў 25 галасоў з 31-го ні Чыгір ні Ганчарык не атрымалі на Рабочай групе Асамблеі ні аднаго голасу.

Такім чынам дэмакратычныя арганізацыі Беларусі (усяго іх больш 400) вызначыліся. Справа за дэмакратычнымі партыямі, якім знайсці паразуменне цяжэй, але таксама, магчыма.

Для сяброў ТБМ нагадваем, што ў 1997 - 1999 гадах Сямён Домаш быў сябрам Рэспубліканскай Рады ТБМ.

Стан беларускай мовы становіцца еўрапейскай праблемай

16 снежня падчас Круглага стала праваабарончых арганізацый, які праходзіў у місіі АБСЕ з удзелам сп. Віка, Старшыня ТБМ Алег Трусаў звярнуў увагу на грубае парушэнне правоў беларускамоўных грамадзян у адукацыі і асабліва ў вышэйшай. Ён перадаў сп. Віку на нямецкай мове (роднай мове пасла) інфармацыю аб ініцыятыве ТБМ па стварэнні Беларускага Нацыянальнага Універсітэта і паведаміў, што за гэтую ініцыятыву паставілі свае подпісы больш 35000 грамадзян Беларусі. Сп Вік адзначыў актуальнасць гэтага пытання і абяцаў звярнуць увагу міжнароднай супольнасці на гэтую праблему.

Слонімская суполка Таварыства беларускай мовы аб'яўляе конкурс сярод настаўнікаў і выхавацеляў па напісанні ўласнай праграмы выхавання нацыянальна свядомай асобы.

Будуць улічвацца кірункі дзейнасці, цікавыя формы працы, прапановы, знаходкі. Памер праграмы не больш за 2 друкаваныя аркушы.

Праграмы дасылайце па адрасе: Слонім, вул. Брэсцкая, 103/1, кв.61. Пераможцаў чакаюць узнагароды!

Беларуская мова-
ТБМ
наша будучыня

Ахвяраванні на ТБМ

1. Ліцьвінава Людміла (Менск)	1.000
2. Зімніцкая Валянціна (Менск)	1.000
3. Міхась Жарнасек (Менск)	200
4. Макарэвіч Надзея (Менск)	500
5. Бародзіч Ганна (Менск)	500
6. Чарнаморцава Валерыя (Менск)	200
7. Кажамякіна Людміла (Менск)	1.000
8. Казлоўская Іна (Менск)	500
9. Петрушковіч Васіль (Менск)	2.100
10. Рудзеня Л.У. (Менск)	1.000
11. Ганчарова В.А. (Менск)	500
12. Іпатава Вольга (Менск)	5.000
13. Міцкевіч У.В. (Менск)	4.000
14. Суполка "Сотвар" (Менск)	7.500
15. Алесь Марачкін (Менск)	20 $
16. Анд. Валчук-Волчак (Польшча)	10 DM
17. Петруковіч Васіль (Менск)	2.100
18. Кафедра сучаснай беларускай мовы БДУ (Менск)	8.000
19. Мішук Георгі (Менск)	5.000
20. Брылеўская (Віцебская вобласць)	10$
21. Грынько Лілея (Менск)	1000
22. Ляцяга Ігар (Менск)	1000
23. Чэрапко Зоя (Менск)	1000
24. Глушакоў Кастусь (Менск)	1000
25. Малочка Ларыса (Менск)	1000
26. Коцік Аляксандр (Менск)	2000
27. Смялянская Ганна (Менск)	2000
28. Бахвалаў Дзмітры (Менск)	500
29. Старасценка Ал. (Менск)	2000

З Калядамі вас, дарагія беларусы!

“ШАНУЙЦЕ МОВУ, КАБ НЕ ЎМЁРЛІ!”

10-11 лістапада Берасцейская гарадская арганізацыя ТБМ сумесна з навуковаасветніцкім цэнтрам імя У. Калесніка правялі ў Берасцейскім дзяржаўным універсітэце рэспубліканскую навуковую канферэнцыю, прысвечаную 160-годдзю з дня нараджэння Ф. Багушэвіча “Шануйце мову, каб не ўмёрлі!”

У канферэнцыі выказалі жаданне ўдзельнічаць такія вядомыя навукоўцы і літаратуразнаўцы як Алег Лойка і Уладзімір Мархель, Уладзімір Содаль і Уладзімір Гніламёдаў... Не ўсе з запрошаных гасцей змаглі прыехаць, але як заўважыў Мікола Хаўстовіч (Менск), працу шасці секцый берасцейскія навукоўцы змаглі забяспечыць сваімі сіламі.

У творчасці Ф. Багушэвіча (А. Майсейчык), Ф. Багушэвіч у коле рамантыкаў (Г. Праневіч), творчасць Ф.Багушэвіча ў ацэнках заходнебеларускай крытыкі (К. Мароз), а таксама ў ацэнках У.Калесніка (З.Мельнікава), Ф.Багушэвіч у гісторыі беларускай літаратурнай мовы В. Емельяновіч), мова Ф.Багушэвіча ў праекцыі лінгвакультуралагічных паняццяў “асобамаса” (М. Аляхновіч), верш Ф. Багушэвіча “Смык” у святле сучасных маральных праблем (Ю. Паталкоў), вытокі “Дудкі беларускай” (У. Лебедзеў), жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча ў школьным курсе пасляваеннага перыяду (Г. Снітко), а таксама ў пазакласнай працы ў школе (Л. Асташонак)...



10 лістапада 2000 г. Літаратуразнаўца Мікола Хаўстовіч і старшыня Берасцейскай гарадской арганізацыі ТБМ Марыя Новік.

На секцыйных пасяджэннях: “Асоба і творчая спадчына Ф.Багушэвіча”, “Творчая спадчына Ф.Багушэвіча: праблема метаду і стылю”, “Францішак Багушэвіч і культурна-гістарычны кантэкст XIX-XX стст.”, “Лінгвакультуралагічны змест творчай спадчыны Ф.Багушэвіча”, “Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць”, “Асветніцкія ідэі і спадчына Ф. Багушэвіча ў сістэме адукацыі Беларусі” прагучала больш за 60 дакладаў і паведамленняў.

Самыя разнастайныя праблемы і пытанні, звязаныя з асобаю Ф.Багушэвіча закранялі-разглядалі ўдзельнікі канферэнцыі: дэманалогія ў беларускай літаратуры (М. Хаўстовіч), праблема назовы і саманазовы Беларусі і беларусаў у творчасці Ф. Багушэвіча (В. Зарэцкая), тэма лёсу ўніятаў

Вельмі актыўна далучыліся і плённа працавалі на канферэнцыі выкладчыкі кафедры гісторыі Беларусі. У цэнтры іх увагі былі розныя пытанні: Ф. Багушэвіч і гісторыя роднага краю (Н. Галімава), народныя ідэалы ў творчасці Ф. Багушэвіча (Л. Ермаковіч), уплыў гістарычных падзей на развіццё нацыянальнай літаратуры ў XIX стагоддзі (Г. Кудзіна) і інш.

Актыўна ўдзельнічалі ў канферэнцыі студэнты філалагічнага факультэта, а таксама факультэта замежных моў. Запомніліся ўдзельнікам канферэнцыі грунтоўнае паведамленне студэнткі Іны Навіцкай “Францішак Багушэвіч і Альгерд Абуховіч”, адметнае і цікавае выступленне Лебедзевай Марыі “Духоўны свет лірычнага героя Ф. Багушэвіча”, а таксама Ірыны Поўх, якая прапанавала прысутным свае назіранні над перакладамі вершаў Ф. Багушэвіча на рускую мову.

Пра “мову нашу такую ж людскую і панскую...” гаварыла на пленарным пасяджэнні прафесар Галіна Малажай. А доктар філалагічных навук Васіль Сянкевіч выступіў са своеасаблівым лінгвафіласофскім эсэ “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай!”, зазначыўшы, што выказванне гэта закранае перш за ўсё праблему экзістэнцыяльную – праблему існавання. Гэтую ж думку пацвердзіла ў сваім дакладзе і загадчыца кафедры славянскіх моў Станіслава Каралевіч: “Як квінтэсенцыя грамадзянскіх і эстэтычных поглядаў Багушэвіча ўспрымаюцца яго выказванні пра родную мову, змешчаныя ў знакамітай прадмове да зборніка “Дудка беларуская”. Глыбокія, адточаныя, на сённяшні дзень афарыстычныя думкі: “Мова нашая... такая ж людская, як... і іншая якая”; “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”, “Гаворка, язык і ёсць адзежа душы” і інш. – гэта не дэкларатыўныя лозунгі. Гэта высновы, зробленыя ўсім жыццём паэта: падсумаванне яго шматгадовых роздумаў пра лёс “Зямлі-маткі”, “святое нашае мовы”, пра народ, якога ўжо тады было “не жменька, а з шэсць мільёнаў”; вынікі яго нястомных росшукаў “беларускіх моўных драбніцаў”; здабыткі яго творчай працы, што не толькі адлюстравала сацыяльна-гістарычную рэчаіснасць тагачаснай Беларусі, але найперш паказала “адзежу душы” беларуса – спрадвечную бацькаву мову”.

Удзельнікі канферэнцыі атрымалі ў падарунак кнігі ад Таварыства беларускай мовы, а таксама музычны падарунак – ад навучэнцаў Берасцейскага музычнага каледжа імя Р. Шырмы. Філіпавец Кацярына (фартапіяна), Баброва Юля (скрыпка), Федарцова Тацяна (віяланчэль), Юрашкевіч Вольга (фартэпіяна) выканалі класічныя творы (кіраўнік – Альшэўскі Уладзімір Іванавіч), якімі проста зачаравалі і адначасова вельмі ўзрушылі ўсіх прысутных. Бо кожны ведаў, як любілі музыку ў сям'і Багушэвічаў...

А назаўтра ўдзельнікі канферэнцыі ехалі ў Белавежскую пушчу, успаміналі “Князя Вітаўта” ля сцэнаў вежы Камянецкае (не Белае), хоць, як жартавалі – “Белая, бо чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася”.

Дзень выдаўся гожы, светлы... Экскурсавод успамінаў былыя часы, Валечку Талкунову, Станіслава Панятоўскага, СССР... А з намі побач ля магутных дубоў, у векавечнай пушчы крочыў Францішак Багушэвіч, разважаючы пра лёс беларускага народа, нацыянальнага адраджэння і роднай мовы.

Святлана Воранік. Берасце.

P.S. Ірына Поўх, а таксама Наталля Пархачук сталі пераможцамі конкурсу на лепшую творчую працу, прысвечаную Ф. Багушэвічу, якія праводзіла Берасцейская гарадская арганізацыя ТБМ.

МАЛІТВА ПРАЗ СТАГОДДЗЕ

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб народ мой манкрутам не быў...
На каленях не поўз да чужога,
Там, дзе продкаў магілы, каб жыў.
Не цураўся каб мовы дзядоў,
Каб не ўмёрла ў чужыне яна.
Белы коннік па полі ізноў
Каб імчаў ад відна да відна.
Ведаў каб Еўфрасінню мой сын,
Князя Вітаўта каб паважаў.
Не схіліліся каб каласы
Пад сярпом, што чужынец каваў.
Каб не выракся роднай зямлі,
Помніў каб, што бацькі ў яго ёсць.
Каб вярнуўся сюды хоць калі
Беларус – не чужынец, не госць.
Так прасі ж ты ў Бога, малі,
Каб народ мой манкрутам не быў...

Поўх Ірына, студэнтка II курса факультэта замежных моў.

* * *

Дзе ж цяпер Беларусь? – спытаю.
“Там яна, дзе наша мова жывець”.
Братцы мілыя, аб родным краі
Багушэвіч вам песні пяе.

Ды прыклаўшы дудку да вуснаў,
Ды ўзяўшы ў рукі смык,
Аб радзіме сваёй – Беларусі –
Вам зайграе “дурны мужык”

Ён шукае праўды на свеце,
І “хрышчоны” быў за яе.
Не дае Бог хадзіці ў саеце,
Доля цяжкае не абміне.

І ён грае аб гэтай долі:
Як не роўна ўсё на зямлі.
Марыць сэрца аб вечнай волі,
Каб яе дачакацца маглі.

Усе, хто праўды й далей шукае.
Грае й думае думу ён.
“А адкуль ты і хто?” – спытаюць.
“Я Барысаўскі. Рэўка Сымон”.

Пархачук Наталля, студэнтка II курса факультэта замежных моў.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ  МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Праспект Машэрава, 11, 220004, г. Мінск
Тэлефон (017) 223 75 74, 223 71 76
Тэлефакс (017) 223 90 45

Проспект Машэрова, 11, 220004, г. Минск
Телефон (017) 223 75 74, 223 71 76
Телефакс (017) 223 90 45

06.12.2000 г. № 08-1/5756г.

Мінск, вул.Румянцава, 13
Старшыні Таварыства беларускай мовы
Імя Ф.Скарыны Трусаву А.А.

Паважаны Алег Анатольевіч!

У адпаведнасці з даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Міністэрства культуры сумесна з Саюзам Беларускіх пісьменнікаў разгледзелі Ваш зварот ва Урад ад 1 лістапада 2000 г. № 719.

Адзначаючы вялікі ўклад Міхася Зарэцкага ў развіццё беларускай літаратуры, тым не менш не маем магчымасці з-за дэфіцыту бюджэтных сродкаў прыняць спецыяльную дзяржаўную праграму па святкаванні юбілею пісьменніка і драматурга.

Тым не менш, з нагоды 100-годдзя М. Зарэцкага ў Доме літаратара будзе праведзена ўрачыстая вечарына. На яго радзіме адбудуцца літаратурныя чытанні і канцэрт прафесійных і самадзейных артыстаў.

У публічных бібліятэках будуць падрыхтаваны выставы твораў пісьменніка, у Палацах культуры і клубах пройдуць спектаклі самадзейных артыстаў па творах М.Зарэцкага і тэматычныя вечары.

Асобныя мерапрыемствы рыхтуюць Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў і Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, а таксама Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” і “Беларускаму відэацэнтру” дадзены даручэнні зрабіць адпаведны летапісны матэрыял для выкарыстання ў дакументальных кіна-, відэа- і тэлефільмах.

Намеснік Міністра В. К. Гедройц.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ
Камісія па нацыянальнай бяспецы
Дом Урада, 220010, г. Мінск
тэл./факс (017) 222-63-35, факс (017) 227-37-84



НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
Комиссия по национальной безопасности
Дом Правительства, 220010, г. Минск
тел./факс (017) 222-63-35, факс (017) 227-37-84

8 декабря 2000 г. № 05-3/6274-4

Старшыні ГА “ТБМ імя Ф.Скарыны”
Трусаву А.А.

На № 782 ад 01.12.2000г.

Шаноўны Алег Анатольевіч!

Шчыра дзякую за віншаванне з нагоды майго абрання на пасаду старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы.

Пры адказе на першае Ваша пытанне з прыемнасцю магу канстатаваць, што я валодаю беларускай і рускай мовамі ў аб'ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў.

Што датычыцца другога пытання, лічу неабходным звярнуць Вашу ўвагу на артыкул 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паводле якога дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” (частка першая артыкула 8 “Мова справаводства і дакументацыі”) у Рэспубліцы Беларусь мовамі справаводства і дакументацыі, а таксама мовамі ўзаемаадносін дзяржаўных органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў з'яўляецца беларуская і (або) руская мовы.

Падзяляю Вашы спадзяванні, што сумеснымі намаганнямі дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў беларускай мове будзе вернута ранейшае гістарычнае месца.

З павагай,

Старшыня камісіі Б. С. Бікінін.



Свята Слуцкіх герояў у Адэлаідзе

Наша парафія Беларускай Аўтакефальнай праваслаўнай царквы 26. 11. 2000 г. ушанoўвала Слуцкіх герояў. Была адпраўлена паніхіда па Слуцкіх героях. У царкве адспявалі царкоўны гімн Магутны Божа.

Наш настаяцель айцец пратаіярэй Пятро Касацкі, сказаў вельмі чулую пропаведзь. Пасля панахіды ўсе прысутныя пайшлі ў прыцаркоўную залу на абед, які быў прыгатаваны сястрыцтвам. Святар дабраславіў ежу на агульным стале. Царкоўны хор адспяваў нацыянальны гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", жалобны марш "Спі пад курганам герояў" і "У гушчарах". Спадар Уладзімір Акавіты пад шчодрыя воплескі прачытаў верш "Пад гоман вясёлы". Пачаўся абед, які працягваўся да 5 гадзін. Усе разышліся да дому ў добрым настрої.

С пашанаю да Вас У. Акавіты.
Адэлаіда, Аўстралія.

Віншую Вас са Святамі калляднымі і зычу шчасліва Новага году 2001.

На здымку: Паніхіда па Слуцкіх героях. Два жаўнеры трымаюць сцягі: беларускі і аўстралійскі.

Дачакаліся

Выдавецтва "Наша Ніва" мае прыемнасць паведаміць пра завяршэнне працы над Слоўнікам Беларускай Мовы (класічны правапіс). Да Новага году слоўнік будзе цалкам змешчаны ў сеціве: http://slounik.hypermart.net/

Слоўнік складзены на падставе распрацовак Вінцука Вячоркі і пастановаў Пражскай правапіснай нарады. Рэдактар слоўніка -- Сяргей Шупа.

Гэтую публікацыю мы разглядаем, як пілотную і запрашаем Вас да абмеркавання. Пасля разгляду ўсіх прапановаў у 2001 годзе мы плануем выверанyю версію Слоўніка выдаць у кніжным фармаце.

З павагай, Сяргей Дубавец.

Сустрэча ў школе

11 лістапада ў СШ № 87 у тыдзень беларускай мовы да школьнікаў па запрашэнню настаўніцы роднай мовы Галоўкінай Вольгі Віктараўны завіталі супрацоўнікі рэдкалегіі часопіса "Бярозка" – Алесь Наварыч і Уладзімір Мароз, а таксама старшыня гарадской Рады ТБМ Алена Анісім.

Сп. Алесь Наварыч расказаў гісторыю стварэння часопіса, пазнаёміў з рубрыкамі, пачытаў некалькі твораў, напісаных вучнямі з розных куткоў Беларусі, і запрасіў прысутных таксама паспрабаваць свае творчыя сілы і напісаць у рэдакцыю пра тое, што хвалюе. Уладзімір Мароз – адказны рэдактар часопіса – пачытаў некалькі сваіх вершаў рознай тэматыкі: ад патрыятычных да глыбока лірычных.падчас няэмушанай размовы высветлілася, што вучні не абыякавыя да праблем развіцця роднай мовы. На занятках яны склададлі бізнес-план па яе развіццю. Вось некаторыя іх прапановы:

1.Рэклама тавараў павінна рабіцца на беларускай мове.

2.Усе тавары, у тым ліку і прадукты, афармленыя на дзяржаўнай беларускай мове.

3. Павінны існаваць добраўпарадкаваныя садкі з басейнам, дзе б выхаванне вялося па-беларуску зацікаўленымі ў сваёй працы выхавацелямі і нянечкамі.

4. Наладзіць на беларускім тэлебачанні шэраг цікавых беларускамоўных перадач.

Па праўдзе кажучы, вуснамі дзяцей агучаная ісціна. Такое б мысленне ды адказным асобам нашай дзяржавы. Глядзіш, і памянела б размоў накопт "недасканаласці нашай мовы і немагчымасці стварыць на ёй штосьці геніяльнае".

Старшыня гарадской арганізацыі ТБМ, якая самым непасрэдным чынам удзельнічала ў правядзенні гэтай сустрэчы, расказала школьнікам пра конкурс "Мой радавод", пазнаёміла з дзейнасцю ТБМ, з газетай "Наша слова".

Перад адыходам госці прайшлі крыху па школе, наведалі кабінет беларускай мовы. Звычайная школа, звычайныя дзеці, звычайныя настаўнікі – і ўсё ж... Не пакідае ўражанне таго, што не ведаем мы ўсіх сваіх прыхільнікаў, недастаткова працуем з імі. Толькі з'яднаўшы ўсе намаганні ў адным кірунку, можна дабіцца станоўчага выніку.

Алена Анісім.

Чарговыя семінары адбыліся ў Менску і Магілёве

9 снежня адначасова ў Магілёве і Менску адбыліся семінары "Я магу жыць лепей". Менскі семінар праводзіла вядомая ў Беларусі фалькларыстка і журналістка Антаніна Хатэнка. На занятках прысутнічалі людзі розных узростаў і прафесій, гэта пенсіянеры і студэнты, працоўныя і службоўцы. Удзельнікі семінару маглі даведацца не толькі аб тым, як выпрацоўваць упэўненасць ў сваёй здольнасці жыць лепей, але і атрымалі надзвычайную асалоду ад цудоўнай і дасканалай беларускай мовы, на якой праводзіла заняткі вядучая семінару.

Заняткі ў Магілёве праводзіла выкладчыца Беларускага універсітэта культуры, намесніца старшыні ТБМ Людміла Дзіцэвіч. У семінары прынялі ўдзел студэнты і выкладчыкі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта і актывісты ТБМ з Бялынічаў і Асіповічаў.

Наступны выяздны семінар плануецца правесці ў Асіповічах. Жадаючыя атрымаць практычныя веды, якія дапамогуць дасягнуць лепшых вынікаў у жыцці, калі ласка, звяртайцеся да старшыні Асіповіцкай раённай арганізацыі Таццяны Барэль па тэлефоне: 6-20-30.

Сяржук Кручкоў.

Нашыя шэрагі зноў выраслі

На апошніх паседжаннях Сакратарыяту што адбыліся 23 лістапада і 7 снежня зарэгістраваны новыя суполкі ТБМ: Суполка пры Амбросевіцкай школе Мастоўскага р-на (4 асобы) кіраўнік Ларыса Курганава, гарадская арганізацыя ТБМ у Мастах (кіраўнік Лявон Карповіч), суполка пры рэдакцыі часопіса Бярозка (6 чалавек), суполка пры рэдакцыі газеты Раніца (10 чалавек), Браслаўская суполка ТБМ (13 асобаў, кіраўнік Надзея Шыдлоўская) і суполка "Волат" з Барысава (8 чалавек).

На наступным Сакратарыяце будзе разгледжана пытанне Нарачкай суполкі з Мядзельскага р-на.

Сакратарыят.

Беларускія студэнты ў Чэхіі

З 4 па 9 снежня група беларускіх студэнтаў гістарычных факультэтаў з усёй Беларусі прыехалі ў Чэхію па запрашэнні Беларускага цэнтру фундацыі "Чалавек у нядолі". Паездка была не толькі азнаямляльнай, але і вельмі павучальнай: маладыя гісторыкі слухалі лекцыі па гісторыі чэшска-беларускіх адносінаў у Карлаўскім універсітэце, наведалі гістарычныя помнікі, бібліятэкі, касцёлы, музеі і ўстановы Чэшскай рэспублікі. Напрыканцы праграмы хлопцы і дзяўчаты сустрэліся з беларускімі студэнтамі, якія навучаюцца ў Чэхіі.

Рада ТБМ імя Францішка Скарыны Савецкага раёна г. Менска праводзіць выбарчую канферэнцыю 23 снежня ў 11 гадзін у Менску на Варвашэні, 8.

КАЛЯНДАРЫКІ АД ТБМ

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны працягвае асвойваць новыя формы работы. У той час, калі дзяржаўныя выдавецтвы не выдалі ніводнага кішанёвага беларускамоўнага каляндарыка, яно вымушана было ўзяць гэту працу на сябе. У лістападзе Таварыства выдала два новыя арыгінальныя беларускамоўныя каляндарыкі на 2001 год.

Першы прысвечаны нашаму слыннаму пісьменніку і паэту Уладзіміру Караткевічу. На першым плане партрэт Уладзіміра Караткевіча, а ў нізе змешчаны крушні Альшанскага замка. Аўтар працы зямляк Уладзіміра Караткевіча вядомы мастак Мікола Купава.

Другі каляндарык адлюстраваў нацыянальны беларускі герб Пагоню. Аўтар Уладзімір Цярохін падкрэсліў няўміручасць нашага старадаўняга герба. Легендарная Пагоня ад сівых Мірскіх муроў сягае ў будучыню – трэцяе тысячагоддзе!

Каляндарыкі можна знайсці на кніжнай выставе ў сядзібе ТБМ па адрасе: Менск, вул. Румянцава, 13 (каля станцыі Метро "Плошча Перамогі") Час працы: 13.30 – 19.00, апроч нядзелі.

Алесь Сабаленка.

Выстава японскіх лялек адкрылася ў Беларускім таварыстве дружбы. Сусветная гісторыя стварэння лялек вельмі старажытнаяб упершыню людзі стварылі ляльку 24 тысячагоддзі таму. У Японіі першая лялька з'явілася, прыкладна, у трэцім тысячагоддзі да нашай эры, у эпоху Дзёман.

Японскія лялькі вырабляюцца з дрэва, паперы, тканіны ці гліны. Разнастайнасць тэхнічных прыёмаў японскіх майстроў стварае цікую, спакоўную прыгажосць, выразнасць і багацце колеравай гамы.

На здымку: экспанаты выставы.
Фота Віктара Талочкі, БелТА.

Уладзімір Содаль

НАВУКА,

АБО ЯК Я АДСВЯТКАВАЎ СТОГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ РОДНАЙ ШКОЛЫ (не скарга, а споведзь)

(Заканчэнне. Пачатак у № 49)

Трывога: куды мы едзем, што з намі будзе, - не пакідала мяне да тае пары, пакуль нашы машыны не спыніліся на пляцоўцы перад будынкам жлобінскай міліцыі. Хоць у міліцэйскім пастарунку нічога добрага нас не чакала, усё ж шлях наш канкрэтызаваўся. Мы прыбіліся да пэўнай дзяржаўнай установы. Калі наша машына, у якой ехалі я і прапаршчык, прыпаркавалася, а мы ехалі следам за першай, то ўсе з першай машыны ўжо стаялі мірным кружком і мірна размаўлялі, нібыта нічога не здарылася. Сын ужо быў без кайданоў і нічога не нагадвала пра нядаўнюю агрэсіўнасць ні адных, ні другіх. Сын лузаў насенкі, якімі яго пачаставаў адзін з ягоных "апекуноў". Перакінуўшыся між сабой якімісь рэплікамі, сына і нявестку павезлі на медыцынскую экспертызу. Я ж застаўся пільнаваць нашу машыну, хадзіў узад-уперад, туды-сюды па міліцэйскім пляцы і думаў. Думаў пра недарэчнасць пражытага дня: навошта я толькі сюды прыехаў, ды да ўсяго яшчэ дзецям сваім нарабіў прыкрасці. Думаў пра кайданы-наручнікі. Мяне калісь моцна ўразіў арышт міністра сельскай гаспадаркі Лявонава. Мне і цяпер уваччу ягоныя выцягнутыя пакорліва рукі пад кайданы. Чамусь з гэтай нагоды я параўнаў з ім сваю маму. Яе двойчы за вайну немцы цёгам цягнулі ў Германію - Нямеччыну, а яна, ашчаперыўшы рукамі прэнт на комінку, не кранулася з месца, і немцы амаль беспрытомную пакінулі яе. А тут міністр, мужчына, пакорліва падстаўляе рукі пад кайданы-наручнікі...

Абяцалі з экспертызы вярнуцца хвілін праз дваццаць. Але мінала добрая гадзіна, а машына пакуль не вярталася. З міліцэйскага пастарунку выйшаў якісь міліцыянт. Ён спыніўся ля ганка і маўкліва тупаў на адным месцы, і зрэдку, нібыта між іншым кідаў кароткія позіркі на мяне. Пра яго я падумаў, што ён таксама, як і я, некага чакае, ці проста выйшаў на якуюсь хвіліну хапіць свежага паветра, відаць, таксама нешта перажываў. Як высветлілася, гэта быў намеснік начальніка Жлобінскай міліцыі. Ён мне сам пра гэта сказаў. Я хацеў расказаць яму, што з намі здарылася, але ён апярэдзіў мяне, сказаў, што ён усё ведае. Я прыадно папрасіў, каб сына адпусцілі дадому, не затрымлівалі, не адлучалі ад нас. "Посмотрим", - паабяцаў намеснік начальніка. І ў гэтым "посмотрим" я пачуў надзею, што злітуюцца. Аднак сына не адпусцілі. Пасля вяртання з экспертызы пачалі складаць пратаколы. З пратаколаў вынікала, што сын "выражался нецензурно", "угрожал побить окна в машине", "срывал пагоны, нагрудные знаки у работников милиции". Вядомыя абвінавачванні!

Ну, не сын, а проста бандыт! Як толькі яго дагэтуль трывала зямля! Я дзівіўся гэтым паказанням і не мог даць веры, каб ён, у такім сваім, і так даволі складаным, незайздросным становішчы, ды яшчэ больш ускладняў яго. На яго гэта было непадобна. Ну, а што ўжо да пагонаў ды знакаў, дык я зусім разгубіўся. Я запатрабаваў, каб у пратакол былі занесены не агульныя, а канкрэтныя мацюкі. На што складальнік пратакола адказаў, што канкрэтныя мацюкі ў пратаколах не фіксуюцца.

Але ж так можна абвінаваціць кожнага – і паспрабуй даказаць, што гэта не так. Ці не пара ў такіх варунках да пратаколаў дадаваць магнітафонныя запісы. Вось тады хай той, хто "нецензурно выражается", паспрабуе аспрэчыць. А так можна пісаць пад настрой што хочаш. Было ж такое і ў Менску. Затрымалі дэманстранта. Склалі пратакол. У пратаколе запісалі: "нецензурно выражался". А на судзе высветлілася: затрыманы – глуханямы! Што ж да мяне, то я ніколі не чуў, каб сын хоць калі мацюкаўся. Ён да дваццаці сямі гадоў у мяне і не курыў, займаўся плаваннем. Яшчэ ў школьныя гады быў кандыдатам у майстры спорту.

Сына, як я спадзяваўся, не адпусцілі. Пакуль яго затрымалі да суда, да панядзелка. Яму, апрача пазбаўлення правоў, пагражала яшчэ да трыццаці сутак за мацюкі, за пагоны, за пагрозы пабіць вокны прыватнай машыны. Але ж пагроза, калі толькі яна была, не ёсць дзеянне. І пагоны ніхто не пазрываў. Ну, але што яшчэ можна зрабіць у наручніках? Плюнуць у вочы? Адным словам, на ўсё жыццё мне запомніцца гэтае святкаванне сотай гадавіны роднай школы.

Дзесьці а другой палове ночы закончылі складанне тых клятых пратаколаў. Складалі трохі нервова, але ў межах трываласці. Трохі, праўда, яшчэ і за мову паспрачаліся. Пратакольныя бланкі былі на беларускай мове, і сын сказаў: "То я свае паказанні буду даваць па-беларуску". "У нас два государственных языка. На каком хотите, на том и пишите", - адказаў яму на гэта старэйшы інспектар.

І сын у сваім першым пратаколе напісаў сваё сведчанне на нашай роднай мове. Да слова: і ўся нашая папярэдняя размова вялася на нашай роднай мове. Калі ўсе графы пратакола сынам былі запоўненыя, інспектар прабегся па напісаным вачыма і абурыўся: "Кто это прочтет, что вы здесь понаписывали". І запатрабаваў вуснага перакладу. Сын пераклаў. Праўда, абурэнне гэтае было, ну, мо і не вельмі злое, але ўсё ж было. Калі за сынам зачыніліся астрожныя дзверы, мы з нявесткай выйшлі з пастарунка і вырашылі начаваць тут жа, пры міліцыі ў машыне. Так, нам здавалася, будзе па-людску: адная і нам будзе больш спакойней, і Марат нас будзе адчуваць, што мы тут, з ім. Але старэйшы лейтэнант міліцыі старшы інспектар Алег Саўкоў, які складаў пратаколы і кіраваў у вёсцы гэтай нашай юбілейнай гасцінаю, супакоіў нас, што нашаму Марату там будзе някепска, што ў панядзелак мы яго атрымаем жывым і здаровым, мо, праўда, не зусім чысценькім, і яго белыя штонікі не будуць такімі белымі, як былі, і нам нявартa сябе марнаваць. І мы, такі супакоеныя, пагадзіліся, каб нас завезлі ў Мормаль, ў той двор, у які мы ехалі, ды метраў трыста не даехалі. Трэба было хоць трошкі абдумацца, што здарылася, што далей рабіць. Душа рвалася на кавалкі і, здавалася, з напружання лопне. Гула, трашчала і галава. На душы пустка, надлом.

Завёз нас у Мормаль усё той жа старэйшы інспектар Алег Саўкоў. І зноў у дарозе думалася пра тыя кайданы! Якое гэта прыніжэнне для годнага чалавека! Якая гэта незалечаная рана!... Няўжо не было ніякага іншага выхаду? Усе ж свае людзі... Прыгадалася з гэтай нагоды зноў з вайны. Нас, дзяцей, немцы адлучылі ад бацькоў. Куды? Ніхто не ведае. Хтось сказаў: "Тапіць будуць!" Нехта ўдакладніў: "На кроў бяруць". На гэтую кроў і ўзялі мяне, шасцігадовага. Здавалася – усё, але знайшоўся такі чаларек і выпрасіў мяне ў фашыстаў. І фашысты адпусцілі. А я, пісьменнік, даследчык, свайго сына не выпрасіў, у сваіх не змог выпрасіць.

Сын адсядзеў у жлобінскай арыштанцы дванаццаць гадзінаў. Павінен ён быў адсядзець двое сутак, да суда ў панядзелак. Але хтось з улады патурбаваўся. І мо не гэтулькі за сына, колькі за мяне. Няёмка ўсё ж: запрасілі на госці, а пасадзілі ў кутузку. Скасавалі назначаны на панядзелак суд. Але выпісалі ўсё ж штраф і ўзялі з нас слова, што не будзем скардзіцца. І мы не скардзіліся, хаця было і ёсць у каго прасіць апякунства. А ўсё, што тут напісана, гэта не скарга. Бо роздум, апеляцыя да ўсіх землякоў, чыімі мы былі гасцямі. Апеляцыя і да жлобінскай міліцыі – няўжо была такая вострая патрэба зрабіць гэтулькі нам турбот, пазбаўляць нас спакою не на дзень, не на два? Для чаго?

З нашай начной валтузні прыгадваецца такая размова. Нашы апекуны прапанавалі:

-Вы можаце на панядзелак і адваката наняць!...

Мяне гэта досыць глыбока зачапіла. Нам, якія прыехалі на радзіму, на дзень-другі, каб пабачыцца з землякамі, пахадзіць па родных сцежках, яшчэ і адвакатам займацца не хапала. На гэтую прапанову я досыць выразна сказаў:

-Хлопцы! Навошта нам тыя адвакаты! Пагадзіцеся, як вы скіруеце той суд, такі будзе і прысуд. Ці ж я няпраўду кажу?

Хлопцы-міліцэйскія дружна пагадзіліся: так, як яны пакіруюць, якія яны дадуць сведчанні, такі будзе і прысуд. І гэтае шчырае прызнанне яшчэ больш падкрэсліла нашу бяспраўнасць.

Дзесьці а палове трэцяй ночы мяне з нявесткай прывезлі да таго двара, дзе мы ўсе збіраліся начаваць звечара. Праўда і гаспадыню напалохалі, не хацела адчыняць. Жыве адна, а тут сярод ночы дзве машыны з запаленымі фарамі. Міліцэйскія ў цемры снуюць, але ўсё ж, пераадолеўшы страх, пусціла ў хату. Хлопцы-міліцэйскія нам і браму самі адчынілі, і машыну ў двор загналі. Усё як мае быць. Вось бы гэтак адразу б! І прабачэння папрасілі, што трохі свята сапсавалі. Я на растанне сярод ночы і некалькі сваіх аўтарскіх кніжачак ахвяраваў ім. Навошта? Мабыць хацеў нагадаць гэтым пра людскасць ім, што пры выкананні службовых абавязкаў варта памятаць пра людскасць. З гэтай нагоды мне прыгадаўся адзін эпізод з майго юнацкага жыцця ў Мормалі. Мне вельмі карцела згадаць яго яшчэ тады, калі сыну майму накладалі на рукі кайданы, калі нас везлі ў Жлобін, але думка мая была нечым іншым перапынена. То згадаю зараз, бо гэта якраз вельмі дарэчы.

...Я працаваў пасля школы, васемнаццацігадовы, пры сельсавеце. Аднаго разу зайшоў у сельсавет дзядзька Іван і пачаў у старшыні прасіць даведку на атрыманне ільготнага білета на чыгунку. Старшыня сельсавету пагалядзеў у свае паперы і сказаў: "Падатак заплоціш – атрымаеш даведку". Дзядзька Іван пачаў прасіцца-маліцца, што як толькі атрымае заробак, адразу ж заплоціць, а цяпер яму тэрмінова патрэбна даведка на ільготны білет – ездзіў у Жлобін на працу. Але старшыня быў няўмольны. Слова за слова – спрэчка перарасла ў бойку. Яны пачалі валтузіцца. Валтузіліся, валтузіліся і неяк праз дзверы аж на вуліцу выкаціліся. Старшыня крычыць мне: "Давай дрот!" Я азірнуўся: і напраўду бачу калючы дрот. Але ж гэта я буду свайго суседа, аднавяскоўца ім вязаць?! Як я буду яму ў вочы глядзець?! Яго ж, лічы справакавалі на адчай. Ён жа прасіўся і маліўся. Чаму ж было не паверыць чалавеку?! І я на старшынёў загад адказаў. "Дзе дрот? Я ніякага дроту не бачу!" За гэты свой мудры ўчынак я сябе ўсё жыццё хвалю і гэтага прынцыпу трымаюся ўсё жыццё, асабліва тады, калі бачу, што з мухі робяць слана, што рэч, вырашальную проста, даводзяць ледзь не да крыміналу.

То вось я думаю: ці абавязкова нам было накідваць на рукі кайданы? Кажу нам, бо кайданы на сынавых руках – яны на маім сэрцы.

...Міне час, і ўсё гэта калі-небудзь абляжацца і будзе ўспрымацца, як незразумелае здарэнне. Але сёння гэта вялікая траўма, вялікая душэўная траўма. І не толькі душэўная. Амаль на цэлыя суткі ў мяне аднялo мову. У аўторак узяў бюлетэнь...

Ці лёгка нам пасля гэтага будзе зноў выбрацца на сваю радзіму?

Там жа ўвесь Мормаль гудзе, як Содалі правялі юбілейную ноч у жлобінскай міліцыі. А ў мяне там пасля юбілею школы акрэслілася гэтулькі новых цікавых задумаў! І хто мяне цяпер туды прывязе: паводле складзеных пратаколаў сына могуць пазбавіць права кіраваць машынай на тры гады!

Ці ёсць ва ўсім гэтым наша віна? Безумоўна, ёсць: не паставілі машыну адразу ў двор. Але нам было б досыць і ківа. Пра гэта я ўжо казаў. Пакуль жа ў псіхалогіі нашай міліцыі пераважае карная метода. Мусіць, гэта такі час. І ён не менш жорсткі, як у вайну. Але ж мы павінны заставацца людзьмі ва ўсялякіх варунках, ва ўсялякіх сітуацыях.

Ці аднаго толькі мяне траўмавалі.

Затрымка міліцыяй Марата рэхам дакацілася і да маёй мамы. Яна, васьмідзесяцігадовая, гэтулькі перажыўшы ўсяго за вайну і пасля вайны, не магла даць веры: дзе гэта бачна, каб гасцей ды ў кутузкі садзілі, каб спакойных паважаных людзей у адно імгненне ў злачынцаў ператварылі?! Яна занепакоілася, затурбавалася і таксама у той жа дзень злегла.

Нам усе спачувалі і дзівіліся, як такое магло стацца! Трэба ж і такому здарыцца: восьмага кастрычніка, у нядзельку, апоўдні, калі сына ўжо выпусцілі з-пад арышту, да нас падышла мілавідная жанчынка і спыталася:

-Не пазнаеце? Я тая медсястра, якая ўчора рабіла медыцынскае асведчанне вас...

І пачала абурацца: "На вакзале чорт ведае што робіцца – і б'юцца, і забіваюць. А яны па Мормалях швэндаюцца, на прыстойных людзей кайданы накідваюць". І расказала, што ў той жа вечар прывезлі пасля нас на асведчанне якогась паляка, але трубка нічога не паказала, дык яны аж зазлаваліся...

Адным словам, дорага нам абышлося святкаванне сотай гадавіны школы. Нам выпісалі, невядома за што, якісь штраф на тры тысячы шэсцьсот рублёў. Але паколькі была нядзелька, нашы дабрадзеі параілі нам папрасіць каго-небудзь з знаёмых, каб ён у панядзелак схадзіў і аплаціў у касе той штраф. Мы так і зрабілі, як параілі нашы дабрадзеі. Заплаціць той штраф падмеюся Георгі Сівіцкі, (мікраён 16, д9, кв.37) рабочы металургічнага завода.

Паводле яго слоў, ён у панядзелак, 9 кастрычніка 2000 года і аплаціў, а квіток перадаў дзяжурнаму міліцыі, бо галоўнае начальства кудысь спяшалася, а квіток параіла перадаць дзяжурнаму: тым не менш, гэтымі днямі з суда маскоўскага раёна прыйшла позва ад судовага выканаўцы, што той штраф да гэтай пары не аплочаны.

Стогадоваму юбілею школы, як бачым, няма канца!

З гэтай жа нагоды я не выканаў і даручэнне Таварыства беларускай мовы. Мне даручалася стварыць у школе хоць невялічкую моўную школьную суполку. Але, як бачыце, нам было не да суполкі.

А ў Мормальскай школе ёсць з каго стварыць такую суполку. Толькі вось не давялося. Чаму? Я доўга думаў: выпадковая гэтая гісторыя з намі, ці загадзя абдуманая, прадуманая. І ні да чаго не дадумаўся. Нашы дабрадзеі кажуць, што выпадковая. Перадаю дакладна іхнія словы: "Каб вы нас фарамі не асляпілі, мы б вас і не зачапілі б!" Людзі мяркуюць, што нас пільнавалі, чакалі. І месцейка выбралі невыпадковае: бязлюднае, незаселенае, каб ніякіх сведкаў не было, каб ніхто не замінаў. Такога яшчэ не было, каб у Мормалі а дзесятай гадзіне вечара ды некага з машыны забіралі. А вось чаму нас забралі – таксама, як і я, ніяк не могуць даўмецца. Я пачаў ужо ў Менску аналізаваць ды асансоўваць свае паводзіны ў школе на юбілейнай сустрэчы. І злавіў сябе на тым, што я раздаваў і дзецям, і дарослым, нават міліцэйскім, а іх там было чалавек з пяць ці болей, газету "Наша слова". У адным з нумароў газеты былі і мае публікацыі. І досыць вострыя, але праўдзівыя, справядлівыя. Адна з іх называлася "Больш не хачу" – пра адносіны кіраўніка Беларусі да нашае мовы. А другая мела назоў "Якая ўлада на Беларусі". Я, безумоўна, праявіў неабачлівасць. Але я пра гэта хапіўся толькі тады, калі раздаў газеты, а дома не паглядзеў, што бяру. Хапіў, што было пад рукою, што пад руку патрапіла і раздаў. Вось нам і паказалі, якая ўлада на Беларусі. А прычына для гэтага была класічная. А можа гэта і не так было. Але ж у пратаколе пазначана: зневажалі прэзідэнта. Ну што ж, дзякуем за гасціну, за навуку! Не ўваходзіла ў нашыя планы наведаць жлобінскі пастарунак у юбілейныя для нашай школы дні. Але давялося: хоць жлобінскіх прусакоў, замест сваіх землякоў, пабачылі! Колькі іх там! Пра гэтых прусакоў будзем век расказваць і дзецям сваім, і праўнукам. І дзесятаму яшчэ закажам. То яшчэ раз дзякуем за навуку. Мусіць, нікому на Беларусі, колькі школьных юбілеяў было, не давялося гэтак справіць такое свята, як мне, як нам!

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для Гарадзенскай вобласці:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзеных інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 18. 12. 2000 г.
Наклад 2900 асобнікаў. Замова № 3082
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 215 руб., 3 мес.- 645 руб.
Кошт у розніцу: 50 руб.